ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (1236) ● 22 сакавіка 1979 г. Цана 2 кап.

## ВЫНІКІ МЕСЯЧНІКА

Правядзенне месячніка абаронна-масавай работы ў БДУ стала традыцыйным.

На чарговым пасяджэнні старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта М. В. Гарлатаў растлумачыў умовы правядзення месячніка, сканцэнтраваў увагу на галоўных яго напрамках.

— Асноўная задача гэтага важнага мерапрыемства, — сказаў ён, — гэта далейшае паляпшэнне ваенна-патрыятычнага выхавання, правядзенне спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту, прысвечаных 61-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Важна, каб кожная нізавая арганізацыя ДТСААФ стала сапраўдным цэнтрам абаронна-масавай работы.

Праца закіпела. Факультэцкія арганізацыі таварыства добра падрыхтавалі і на высокім узроўні правялі ўрачыстыя пасяджэнні, урокі мужнасці, паходы па маршрутах баявой славы.

Аб масавасці гэтых мерапрыемстваў сведчаць наступныя факты: праведзена 20 тэматычных вечароў з удзелам 5.800 чалавек, 98 сустрэч з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, прачытана 420 лекцый, дакладаў пра гісторыю стварэння і баявы шлях Савецкіх Узброеных Сіл, на якіх прысутнічала 7.900 чалавек. Лепшымі сталі камітэты ДТСААФ біялагічнага, хімічнага факультэтаў і факультэта журналістыкі.

Цікава прайшла сустрэча з ветэранамі вайны на факультэце журналістыкі. Перад студэнтамі выступілі былыя ваенныя лётчыкі прафесар Р. В. Булацкі, Р. А. Жураўлёў, В. П. Рамашоў. Яны расказалі аб мужнасці і гераізме нашых землякоў, аб бязмежнай любві да Радзімы. На памяць аб сустрэчы ветэранам былі ўручаны каштоўныя падарункі. А дэманстрацыя кінафільма зрабіла гэту сустрэчу яшчэ больш урачыстай і запамінальнай.

Напружана праходзілі спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту. Першае месца па кулявой стральбе заваявала каманда геаграфічнага факультэта. Незвычайным быў такі факт, што другое, трэцяе і чацвёртае месцы прысуджаны адразу тром камандам, набраўшым аднолькавую колькасць ачкоў: камандзе факультэта журналістыкі, фізічнага і біялагічнага факультэтаў.

У асабістым першынстве па стральбе з вінтоўкі МВ-1 лепшымі сярод мужчын былі: С. Міканавец —біяфак, В. Дзюба — журфак, А. Копцік — падрыхтоўчае аддзяленне, а сярод жанчын Н. Нішт і Л. Купрыянец (хімфак), Т. Драздова (ФПМ). Спаборніцтвы па радыёспорту праводзіліся па двух відах: прыём на слых і перадача на ключы радыяграм літарнага і лічбавага тэкстаў. Першае месца заваявала каманда факультэта журналістыкі. Трэба адзначыць, што журналісты заваёўваюць першыя месцы на працягу некалькіх гадоў. І зараз яны сталі пераможцамі (402,5 бала). У гэтым вялікая заслуга П. Стасевіча і А. Уліцёнка —інструктараў па радыёспорту. Другое месца заняла каманда фізічнага факультэта з вынікам 384,16 бала, а трэцімі былі радыёфізікі (368,3 бала). Ва ўсіх відах гэтых спаборніцтваў замыкаюць табліцу філолагі.

За месячнік падрыхтавана 54 разраднікі. 400 чалавек здалі нормы ГПА.

**А. КРЫЖ, старшыня арганізацыі ДТСААФ журфака.**

## СУБОТНІК САЛІДАРНАСЦІ

Будаўнічы аб'ект, на які 17 сакавіка выйшлі байцы нашага будатрада, нам добра знаёмы. На рэканструкцыі стадыёна «Дынама» мы працавалі яшчэ ў час апошніх канікулаў, калі да назвы атрада імя Ленінскага камсамола былі далучаны словы «зімовы камуністычны».

Зараз на календары атрада — падрыхтоўка да летняга працоўнага семестра. Часткай яе стаў суботнік на алімпійскім аб'екце. Атрад імя Ленінскага камсамола першым ва універсітэце адгукнуўся на ініцыятыву СБА імя Нікольскага правесці працоўныя дэсанты на будоўлях горада і зароблены грошы пераведці ў фонд салідарнасці з народам В'етнама.

Напярэдадні суботніка атрадныя лектары сустрэліся з в'етнамскімі студэнтамі, якія займаюцца на падрыхтоўчым факультэце універсітэта, і расказалі в'етнамскім сябрам аб гісторыі і традыцыях студэнцкага будаўнічага руху.

У суботніку салідарнасці прымаў удзел увесь атрад. Лепш за ўсіх са складанымі аперацыямі па мантажу арматуры столі справіліся П. Ліістраценка, І. Буйко, У. Прановіч, В. Раманюк і А. Дамарад.

У фонд В'етнама пералічаны першыя 120 рублёў. Працоўная вахта салідарнасці працягваецца.

**С. НОВІКАЎ, студэнт журфака.**

## ЗАДАЧЫ ДНЯ

Дзесяць год існуе ў БДУ падрыхтоўчае аддзяленне. За гэты час яго скончыла 1797 чалавек. Сярод іх 870 рабочых, 157 калгаснікаў, 770 дэмабілізаваных з радоў Савецкай Арміі. Партыйную арганізацыю універсітэта папоўнілі 576 камуністаў.

Большасць слухачоў аддзялення паспяхова авалодваюць ведамі, становяцца спецыялістамі высокай кваліфікацыі. Сярод іх ёсць выдатнікі вучобы, імянныя стыпендыяты, выпускнікі працуюць выкладчыкамі, супрацоўнікамі універсітэта. У час вучобы на факультэтах былыя слухачы аддзялення вядуць вялікую грамадскую работу, з'яўляюцца парторгамі, камсоргамі, старастамі, камандзірамі і камісарамі СБА.

Рэктарат, калектыў падрыхтоўчага аддзялення, кафедры і факультэты многае зрабілі для ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, арганізацыі набору на аддзяленне. Аднак вядома, колькі праблем звязана з работай падрыхтоўчага аддзялення. Асноўная з іх — нізкая паспяховасць слухачоў, а затым і студэнтаў універсітэта.

У чым жа прычыны недастатковай паспяховасці слухачоў і якія шляхі яе паляпшэння?

Першае — гэта адсутнасць конкурсу на прыродазнаўчыя спецыяльнасці. З году ў год план набору на падрыхтоўчае аддзяленне выконваецца за кошт павелічэння колькасці залічаных слухачоў па гуманітарных спецыяльнасцях. Гэта не прыносіла карысці. На гуманітарных факультэтах павялічваўся конкурс на стацыянар і зніжалася паспяховасць з-за вялікага прытоку студэнтаў з падрыхтоўчага аддзялення, а на прыродазнаўчых факультэтах паступова прывыкалі да такой сітуацыі, падрыхтоўчая работа вялася недастаткова.

У пастанове ЦК КПСС і Вярхоўнага Савета СССР аб стварэнні падрыхтоўчых аддзяленняў указваецца, што ВНУ абавязаны весці сістэматычную, мэтанакіраваную работу па адбору працоўнай моладзі, загадзя выяўляць найбольш дастойных рабочых і калгаснікаў для вучобы на падрыхтоўчым аддзяленні. За 10 год у нас не створана сістэма набору слухачоў. План набору на падрыхтоўчае аддзяленне павялічваецца, а факультэты і калектыў падрыхтоўчага аддзялення штогод не выконвалі план набору на прыродазнаўчыя спецыяльнасці і не знаходзілі шляхоў для станоўчага вырашэння пытання.

У дагаворах аб навуковым супрацоўніцтве з прадпрыемствамі неабходна ставіць абавязковую ўмову аб накіраванні юнакоў і дзяўчат на вучобу на падрыхтоўчыя аддзяленні. Так у гэтым годзе паступіў хімічны факультэт, які заключыў шэсць дагавораў з буйнымі прадпрыемствамі рэспублікі.

Неабходна звярнуць увагу на нашы вячэрнія і завочныя падрыхтоўчыя курсы. Зараз там займаецца 3500 чалавек, на прыродазнаўчых спецыяльнасцях — 1900.

Аслабленне падрыхтоўчай работы прыводзіць да таго, што замест перадавых рабочых і калгаснікаў мы залічваем юнакоў і дзяўчат, якія яшчэ не заслужылі такое права. У гэтым годзе 101 слухач мае стаж работы адзін год.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## ПА БДУ — інфармацыя

У пачатку красавіка ў БДУ ў рамках міжнароднай салідарнасці будзе праводзіцца агульнауніверсітэцкі конкурс палітычнага плаката. У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя. Пераможцаў чакаюць узнагароды — граматы і каштоўныя падарункі.

* * *

19 сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне савета Белдзяржуніверсітэта. Па першаму пытанню — «Аб рабоце падрыхтоўчага аддзялення» — выступіў загадчык ПА А. Г. Слука. Ён звярнуў увагу на галоўныя праблемы і задачы падрыхтоўчага аддзялення, унёс шэраг прапаноў па паляпшэнню яго работы.

Аб выніках навуковага і культурнага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі ў 1978 годзе савету далажыў прарэктар БДУ па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. Чэпа.

Рэктар БДУ, акадэмік АН БССР У. А. Белы ўручыў дыпломы і граматы студэнтам, якія перамаглі ва Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук. Па выніках гэтага ж конкурсу шэраг выкладчыкаў атрымаў граматы за кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі работамі.

## Вялікае дзякуй за дапамогу

У красавіку 1979 года ў Афінах будзе праходзіць II з'езд камуністычнай моладзі Грэцыі. На яго падрыхтоўку сёння накіравана ўся дзейнасць маладых грэчаскіх камуністаў. Праходзяць справаздачныя пасяджэнні ў мясцовых партыйных арганізацыях, зацверджаны і надрукаваны тэзісы аб рабоце з'езда, пачат збор сродкаў для яго правядзення. Матэрыяльную дапамогу камуністам аказваюць працоўныя і сяляне, члены партыі і беспартыйныя. Аб гэтым расказваюць грэчаскія студэнты, якія займаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна.

Грэчаскае зямляцтва ў Мінску нешматлікае — усяго 6 чалавек. Трое займаюцца на факультэце журналістыкі, трое — на аддзяленні палітэканоміі гістфака БДУ, але, нават знаходзячыся ўдалечыні ад радзімы, яны не засталіся ў баку ад гэтай знамянальнай для іх партыі падзеі. Рабяты вырашылі арганізаваць суботнік, а грошы, зароблены на ім, пералічыць у фонд з'езда.

За дапамогай яны звярнуліся да савецкіх і замежных сяброў. На іх просьбу адгукнуліся не толькі студэнты журфака і аддзялення палітэканоміі, але і ФПМ, фізічнага, геаграфічнага факультэтаў, а таксама члены кубінскага, сірыйскага і іншых зямляцтваў. На працягу некалькіх дзён працавалі яны на будаўніцтве алімпійскага аб'екта — гасцініцы «Планета». Усе грошы, зароблены на суботніку, будуць пералічаны ў фонд з'езда.

— Мы вельмі ўдзячны нашым сябрам, задаволены, што так шмат знайшлося людзей, якія бескарысна выйшлі на працу дзеля таго, каб дапамагчы нашаму маладзёжнаму руху. Мы бачым у гэтым салідарнасць усяго савецкага народа з барацьбой камуністаў Грэцыі, — гэта слова Дзімітрыса Фаціназа, які выказаў думкі ўсяго грэчаскага зямляцтва. У выказваннях савецкіх студэнтаў, удзельнічаўшых у суботніку, адчувалася радасць. Радасць ад таго, што дапамог сябру, прынёс карысць людзям.

**С. ШАБАН.**

На канферэнцыі чытачоў па кнізе І. А. Ласкіна «На шляху да пералому», якую правёў на гістфаку аддзел абслугоўвання універсітэцкай бібліятэкі разам з дэканатам і грамадскімі арганізацыямі факультэта, прысутнічаў сам аўтар кнігі. Генерал-маёр І. А. Ласкін расказаў аб гістарычнай Сталінградскай бітве і аб тым, у прыватнасці, як ён браў у палон фельдмаршала Паулюса.

Фота Г. Краскоўскага.








# «Я РУССКИЙ БЫ ВЫУЧИЛ ТОЛЬКО ЗА ТО, ЧТО ИМ РАЗГОВАРИВАЛ ЛЕНИН»

# МОВА, БЛІЗКАЯ ЎСІМ

Цяжка пераацаніць важнасць той ролі, якую выконвае ў нашы дні руская мова як сродак міжнародных зносін, як сродак атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, сродак атрымання ў карацейшыя тэрміны неабходнай навукова-тэхнічнай інфармацыі.

У цяперашні час больш чым у 90 краінах свету рускую мову вывучаюць звыш 20 млн. чалавек. І лічбы гэтыя з кожным годам павялічваюцца. Усе, хто вывучае рускую мову, асабліва гэта датычыцца замежных студэнтаў, якія займаюцца ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах нашай краіны, дзякуючы рускай мове знаёмяцца з жыццём савецкага народа, з яго велізарнымі поспехамі ў развіцці эканомікі, навукі і тэхнікі, з цудоўнымі дасягненнямі ў асваенні касмічнай прасторы. Вялікая і магутная руская мова дапамагае мільёнам юнакоў і дзяўчат з усіх кантынентаў далучыцца да багацейшай спадчыны рускай нацыянальнай і сучаснай сацыялістычнай культуры народаў, якія жывуць у нашай краіне, пазнаёміцца з гісторыяй першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, што ў сваю чаргу садзейнічае больш глыбокаму разуменню замежнымі студэнтамі нашай савецкай сучаснасці. Кубінец, алжырац, немец, індус гавораць паміж сабой на адной мове, і гэта мова — руская. Ці ж гэта не прыклад таго, як руская мова выхоўвае ў прадстаўнікоў розных нацый пачуццё брацкага інтэрнацыяналізму, пралетарскай салідарнасці.

Метады і прыёмы актывізацыі ведаў, якія набываюцца замежнымі навучэнцамі ў савецкіх навучальных установах, litарознабаковыя. Апрача ўсяго, што звязана непасрэдна з аўдыторнай работай, з вучэбным працэсам, вялікую ролю ў аваладанні замежнымі навучэнцамі рускай мовай адыгрываюць пазааўдыторныя мерапрыемствы: конкурсы на лепшую навукова-даследчую работу, выязныя тэарэтычныя семінары, экскурсіі ў розныя гарады Савецкага Саюза, аўтапаязды «Дружба», вечары пытанняў і адказаў, агляды-конкурсы мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы і інш.

У гэтым навучальным годзе сярод замежных навучэнцаў, якія займаюцца ў СССР, праводзіцца алімпіяда па рускай мове, якая будзе праходзіць на працягу ўсяго года ў тры туры. Зараз падводзяцца вынікі І тура, які праводзіўся ў навучальных установах кафедрамі рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў. У час І тура ў нашым універсітэце замежныя студэнты ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшае сачыненне, на маналагічнае выказванне, у віктарыне «Ці ведаеш ты Савецкі Саюз?» і ў конкурсе на лепшае выкананне рускіх і савецкіх песень і вершаў. Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 293 замежныя студэнты з 40 краін. Усе ўдзельнікі паказалі добрыя веды не толькі па рускай мове, але і прадэманстравалі глыбокія веды па гісторыі, культурнай спадчыне савецкага народа.

Пераможцамі сталі: Бекерт Зібіле (ГДР), Марціна Ятцвавук (ГДР), Іржына Смужова (ЧССР), Франк Іленбург (ГДР), Арыель Фернандэс (Куба), Фам Тхе Лонг (СРВ), Махамед Касым (Афганістан), Махмед Сціль Камара (Гвінея), Луіс Фернандэс (Куба). Кандыдатамі ў каманду пераможцаў сталі: Карына Шпек (ГДР), Сільвія (ГДР), Фам Мінь Хай (СРВ).

Яны будуць удзельнічаць у гарадскіх міжвузаўскіх конкурсах, якія з'яўляюцца ІІ турам алімпіяды. Мы жадаем нашым пераможцам паспяховага выступлення на конкурсах ІІ тура і выхаду ў фінал алімпіяды.

**У. БУДАЙ,**
**І. ЧАРОТА,**
**выкладчыкі кафедры рускай мовы па навучанню замежных грамадзян.**

# МАРА ЗБЫЛАСЯ

Вядомая прымаўка гаворыць: «Колькі моваў ты ведаеш, столькі разоў ты чалавек». Не трэба нават падкрэсліваць, колькі сэнсу ў гэтых словах. Гэта ўсведамляем і мы, студэнткі з Чэхаславакіі.

Два гады таму назад, калі мы прыехалі ў Мінск, руская мова не была для нас зусім невядомай. Ужо ў асноўнай дзевяцігадовай школе нам падабалася яе прыемная мелодыя і рытм. З часам руская мова захапляла нас усё больш і больш. Наша імкненне пазнаёміцца з ёю бліжэй было абумоўлена шматлікімі прычынамі. Без сумнення адной з іх была яе блізкая сувязь з нашай роднай славацкай мовай. Нас прыцягвала яшчэ і багатая культура Савецкай краіны.

У дзяцінстве мы перапісваліся з рускімі школьнікамі. Даведваліся аб жыцці ў першай сацыялістычнай краіне і марылі ў ёй пабываць.

У час падарожжаў у СССР мы захапляліся старажытнымі помнікамі Масквы, цудоўным Ленінградам, дзе нас акружалі гасцінныя рускія людзі. Але ўстанаўленню больш блізкіх кантактаў з імі перашкаджала дрэннае веданне рускай мовы.

І тады нам яшчэ больш захацелася ўдасканаліць свае веды. Гэта магчымасць паявілася ў гімназіі, у спецыяльным класе, у якім рускай мове навучала выкладчыца з Савецкага Саюза. Тут мы ўпершыню пазнаёміліся з майстэрствам вялікіх рускіх і савецкіх пісьменнікаў, вучыліся глыбей пазнаваць Савецкую краіну, рыхтаваліся да вучобы ў савецкіх ВНУ.

Першыя дні нашага знаходжання ў Мінску надоўга застануцца ў памяці. Зразумела, былі цяжкасці. Спачатку нам усюды прыходзілася паўтараць словы «мы не зусім зразумелі»: у магазінах, музеях, кіно, ледзь не на кожным кроку. Але штодзённыя зносіны з рускімі студэнтамі дапамаглі нам навучыцца гаварыць больш бегла.

Прайшло паўтара года... Нам вельмі прыемна чытаць на рускай мове Талстога, Пушкіна, Дастаеўскага. Гэта любімыя нашы пісьменнікі. Праз іх мы пазнаём разнастайнасць рускай мовы, яе адценні. Нават вывучэнне другой замежнай мовы пры дапамозе рускай мовы адыгрывае сваю ролю ў развіцці нашых ведаў. Знаёмячыся з літаратурнымі творамі розных перыядаў, мы ўжо здольны бачыць, як змяняўся не толькі стыль, змест, але і мова, якой карысталіся аўтары.

Зразумела, наша вымаўленне, інтанацыя, нават спосаб, якім мы будуем сказ, яшчэ ўвесь час пад уплывам роднай мовы. Гэтыя і іншыя памылкі можна выправіць толькі пры дапамозе зносін з рускімі сябрамі.

**Я. ГЛАНЯКОВА,**
**М. КУДЗЕЛАВА,**
**Г. СМЕШКАВА,**
**М. КОБЗІКАВА,**
**студэнткі філалагічнага факультэта.**

ЧССР.

ЛЕНІН... У свядомасці людзей гэта слова нараджае вялікі, прыгожы, светлы вобраз, які настолькі неабдымны ў нашым уяўленні, што, здаецца, немагчыма перадаць яго словамі...

Цудоўны чалавек. Геній. Увасабленне самаадданасці, жыццярадаснасці, бессмяротнасці. Гэта з аднаго боку. І сціпласць, шчодрасць, чалавечнасць — з другога.

# ВЕЧНАЯ СУВЯЗЬ

Таму і будуць вечная сувязь і адзінства паміж ім, яго справамі і сумленнымі, гарачымі сэрцамі людзей. Бо само жыццё галасуе за непарыўнасць гэтых адносін.

Студэнт з Мангольскай Народнай Рэспублікі Інхбат Луўсангомба ўпершыню пачуў імя Леніна яшчэ ў дзяцінстве. Цяпер ён не можа дакладна сказаць, калі іменна, але добра памятае, што вельмі рана.

У школе Інхбат Луўсангомба пазнаёміўся больш шырока з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна. Прачытаў некаторыя творы правадыра міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Прачытаная ў тыя гады ленінская праца «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі» засталася ў памяці і па сённяшні дзень.

Шчаслівы для Інхбата быў той дзень, калі здзейснілася доўгачаканая мара: ён — у Савецкім Саюзе! Ён — на Радзіме У. І. Леніна!

І чым больш Інхбат Луўсангомба, вывучаючы гісторыю КПСС, знаёміцца з дзейнасцю У. І. Леніна — «самага чалавечнага чалавека», — тым мацней жаданне авалодаць рускай мовай. Бо здзейсніцца тады яшчэ адна яго запаветная мара: чытаць творы Леніна па-руску. І як мага больш. Бо Ленін — гэта ўсё. Гэта, як сказаў Інхбат, тое, што чалавеку патрэбна, каб стаць і застацца ім — Чалавекам.

— У цяперашні час, — гаворыць Інхбат Луўсангомба, — усе людзі, безумоўна, ведаюць пра У. І. Леніна. Але мангольскі народ Леніна ведае лепш за ўсіх. Бо ён першы ад імя свайго народа прызнаў нашу краіну. Першы з кіраўнікоў урадаў сустрэўся з Сухэбатарам. Мангольскі народ добра памятае тую брацкую дапамогу Савецкай краіны, дзякуючы якой перамагла наша рэвалюцыя. І я хачу з усёй адказнасцю заявіць, што ў сэрцы народа Манголіі У. І. Ленін заўсёды будзе займаць самае вялікае месца.

Значны ўплыў аказаў на лёс мангольскага народа Вялікі Кастрычнік. Ён і яго заваёвы указваюць і цяпер шматлікім краінам той адзіна правільны шлях пабудовы самага гуманнага і светлага жыцця, назва якому — камунізм.

І ўсё гэта — Ленін.

А вось што сказаў Віктар Лі з Конга, які зараз вучыцца на першым курсе факультэта журналістыкі.

— Імя Леніна я пачуў вельмі даўно. Чытаў, глядзеў кінафільмы аб ім. І ўсё гэта зрабіла на мяне вялікае ўражанне. Глыбей жа з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна я пазнаёміўся ў ліцэі, вывучаючы філасофію. Памятаю, што праца У. І. Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя» мяне ў той час вельмі ўзрушыла. І гэта ўзрушанасць цяпер кожны раз ажывае, калі я гартаю старонкі яго таленавітых, цікавых прац.

Маё знаёмства з Савецкім Саюзам пачалося з Маўзалея У. І. Леніна.

Год я быў на падрыхтоўчым аддзяленні ў Данецку. І дзякуючы выкладчыку рускай мовы пра У. І. Леніна даведаўся многа новага. І іменна таму даклад «У. І. Ленін — правадыр і настаўнік працоўных», які я чытаў сваім таварышам, атрымаўся змястоўным і памятным для мяне.

Пра У. І. Леніна ведаюць усе людзі нашай планеты. Вельмі цікавіцца Леніным таксама і афрыканскі народ. І мне, канешне, таксама прыйдзецца дома расказваць пра Уладзіміра Ільіча. А каб да сваіх родных, блізкіх, знаёмых данесці сапраўды рэальны і праўдзівы вобраз гэтага цудоўнага чалавека, разумею, што і сам павінен ведаць пра яго шмат. Гэтаму дапамагае вывучэнне рускай мовы, якому я аддаю значную частку свайго часу.

Вывучаючы работы Уладзіміра Ільіча, я стаўлю на першы план практычнае прымяненне яго запаветаў непасрэдна для нашай краіны. Народ Конга хоча новага, лепшага жыцця. А вось як яго будаваць? Што найбольш характэрна і прымяніма для нашай краіны? Адказ на гэтыя пытанні можна знайсці ў творах Леніна.

І галоўнае, што мне дае знаёмства з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна, гэта правільнае разуменне сапраўднага прызначэння чалавека: змагацца за волю і шчасце ўсіх людзей на зямлі.

**В. ЧУЧМАН.**

